Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 4. С. 145–148

*УДК 821.161.3.09*

# ДЫХАТАМІЧНАСЦЬ ВОБРАЗА МАЦІ Ў ПРОЗЕ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

**К. А. Крыцук-Тарасава,**
*магістр літаратуразнаўства, аспірант кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ*

Паступіў у рэдакцыю 02.10.2024.

*UDC 821.161.3.09*

# DICHOTOMY OF THE IMAGE OF THE MOTHER IN THE PROSE OF MAXIM GORETSKY

**K. Krytsuk-Tarasava,**
*Master of Literature, graduate student of the Department of Belarusian History of literature of the philological faculties of BSU*

Received on 02.10.2024.

У артыкуле выяўлена дваістасць вобраза маці ў прозе Максіма Гарэцкага: жанчына паказваецца праз спалучэнне праяў добрага і злога пачаткаў. Маці выглядае адначасова ахвярай і злачынцай. Раскрыты варыяцыі і матывы парадаксальных паводзін, характэрных для гераінь М. Гарэцкага. Апісаны прыклады патэрнаў у паводзінах жанчыны-ахвяры. Разгледжаны верагодныя крыніцы фарміравання аўтарскіх установак пры стварэнні мастацкіх характараў на аснове біяграфічных звестак пра М. Гарэцкага. Вызначаны асноўны архетып вобраза маці ў творчасці беларускага класічнага пісьменніка.

*Ключавыя словы:* дыхатамія, архетып ахвяры, вобраз маці, патэрны паводзін, унутраныя матывацыі.

The article reveals the duality of the image of the mother in the prose of Maksim Goretsky: the woman is shown through a combination of manifestations of good and evil beginnings. The mother looks both victim and perpetrator. Variations and motives of paradoxical behavior characteristic of M. Goretsky's heroines are revealed. Examples of patterns in the behavior of female victims are described. Probable sources of the formation of author's attitudes during the creation of artistic characters based on biographical information about M. Goretsky are considered. The main archetype of the image of the mother in the work of the Belarusian classical writer is determined.

*Keywords:* dichotomy, victim archetype, mother's image, behaviour patterns, internal motivations.

*Уводзіны.* Творчасць Максіма Гарэцкага мае статус хрэстаматыйнай, таму яе вывучэнне ўваходзіць у прыярытэтныя задачы беларускага літаратуразнаўства. Проза гэтага аўтара найбольш грунтоўна вывучана ў рэчышчы культурна-гістарычнай метадалогіі такімі даследчыкамі, як А. Адамовіч [1], Д. Бугаёў [2], М. Мушынскі [3], Т. Дасаева [4], В. Губская [5] і інш. Аналіз характараў вобразаў-персанажаў і канцэпцыі асобы ў творчасці М. Гарэцкага прадстаўлены ў манаграфіі А. І. Белай [6]. Менш даследаваны псіхалагічны складнік у вобразатворчасці М. Гарэцкага з выяўленнем слядоў пэўных архетыпаў у ментальнасці яго персанажаў, выразных патэрнаў у іх паводзінах, што арганізуе мастацкі сюжэт. Прыкладам спецыяльнай публікацыі з такой праблематыкай можам назваць працу В. М. Губскай «Рэканструкцыя архетыпа як сродак спасціжэння аўтарскага несвядомага...», дзе вылучаецца архетып «раскаянага грэшніка», які, па словах даследчыцы, «адмыслова стасуецца з творам беларускага класіка М. Гарэцкага “Лявоніус Задумекус”» [7, с. 127]. Такі ракурс навуковага разгляду дазваляе па-новаму выявіць дасканаласць псіхалагічнага аналізу ў прозе пісьменніка.

Разгляд вобразаў, асабліва частотных у мастацкай літаратуры, немагчымы без уліку сувязей такіх вобразаў з іх першакрыніцамі – тымі архетыпамі, якія сфарміравалі найперш аўтарскую самасвядомасць і знайшлі адлюстраванне ў мастацкіх творах: характарах персанажаў і аўтарскім стаўленні да іх. Адным з найважнейшых сярод іх выступае вобраз маці. Актыўнае пераасэнсаванне яе асобы ў час сталення ўплывае не толькі на фарміраванне індывідуальнасці і самасвядомасці чалавека, але і на яго ўспрыманне жанчын у цэлым: памкненне зразумець іх, пошук матывацый і роляў у іх паводзінах.

Тэма мацярынства неаднаразова актуалізавалася ў творчасці Максіма Гарэцкага: у такіх творах, як «Маці» (1916), «Панская сучка» (1918), «Дзве душы» (1919), «Літоўскі хутарок» (1915), «Супакой» (1921), «Уцекачы» (1918, надрукаваны ў 1928) і інш. Гэта можа ўказваць на вялікую значнасць вобраза маці як у сацыяльным полі, так і асабіста для аўтара, бо характар выяўлення гэтага вобраза ў Максіма Гарэцкага выключна індывідуальны і не падобны да агульнага правобраза жанчыны ў іншых аўтараў – сучаснікаў Гарэцкага.

Пры аналізе названых вышэй твораў можна вызначыць, што вобраз жанчыны-маці ў творчасці Максіма Гарэцкага грунтуецца на дыхатаміі і вызначаецца дынамічнасцю і неаднастайнасцю. Дзеяннем гераінь рэдка можна даць адназначную ацэнку. Часта жанчына выступае адначасова злачынцам і дабрадзеем, ліхадзеем і ахвярай, сябрам і ворагам. Падобныя рысы выяўляюць аб’ёмнасць, складанасць вобраза, а разам з гэтым і яго праблемнасць у разуменні аўтара.

*Асноўная частка.* У аповесці «Дзве душы», дзе белетрыстычны кампанент важны для аўтара амаль настолькі ж, як і ўвага да экзістэнцыйнага, Максім Гарэцкі фарміруе вобраз маці на аснове апісання дзвюх жанчын: пані і сялянкі Маланні. Пані паўстае перад чытачом устрывожанай, чулай жанчынай, якую ахоплівае страх за першынца: «Сярод агульнай несудзержнай весялосці і скокаў, пад налязаннем начы і музыкі маладую нервовую паню зняцейку агарнуў нез’яснімы сум, і яна вельмі напужала мужа, настойліва бажала

зараз а зараз ехаць дамоў, дзе астаўся іх першачок, трох месяцаў Ігналік» [8, с. 6]. Аўтар зазначае, наколькі важна для маладой пані было быць побач з сынам: «Паня раптам уся задрыжэла. Слёзы пырснулі з воч і апяклі яго руку.

– Ігналік мой!.. Ігналік… Барзджэй дамоў, да яго…» [8, с. 6].

У тэксце мы заўважаем, што прадчуванне не ашукала жанчыну, і яе непакой апынуўся небеспадстаўным. Можам зрабіць вывад, што маці ў гэтым творы турботлівая і ўважлівая да немаўляці і ўласных прадчуванняў. Гэта ўказвае на цесную сувязь паміж маці і дзіцём. Тое ж заўважаем і ў адносінах Маланні і Ігналіка (які насамрэч з'яўляецца яе родным сынам Васілём, бо яна – па жанравых законах белетрыстыкі, выкарыстаных М. Гарэцкім – падмяніла дзяцей, жадаючы Васільку панскай долі): «Нянька любіла свайго панічочка незвычайна. Здавалася, яна любіла яго болей, чымся роднага сына…» [8, с. 8].

Гэтыя паводзіны зноўку ўказваюць на любоў маці да дзіцяці і цесную сувязь паміж імі. Пры гэтым, нягледзячы на блізкія ўзаемадачыненні ўсіх герояў твора, нельга сказаць, што вобраз жанчыны-маці ў аповесці адназначны. Так, у імкненні даць лепшую долю свайму сыну жанчына ахвяруе доляй іншага дзіцяці, а разам з гэтым пазбаўляе яго права, дадзенага ад нараджэння. Такім чынам мы можам сказаць, што бясспрэчная любоў да роднага сына зрабіла жанчыну злачынцай, а сапраўднага паніча ахвярай абставін, што таксама выяўляе вобраз маці як неадназначны і зменлівы.

У апавяданні «Супакой» аўтар рэалізаваў вобраз маці праз асобу пані Сташэўскай, якая мала звяртала ўвагі на сваіх старэйшых сыноў, але з асаблівай увагай, пяшчотай і ласкай ставілася да сваёй дачушкі Ядзі. Дыхатамія гэтага вобраза выяўлена ў асабліва цёплых адносінах з малодшай дачкой, якую яна нарадзіла ў шлюбе, але не ад пана Сташэўскага, і ў амаль поўным ігнараванні старэйшых сыноў, народжаных ад мужа. Жанчына ціха і пакорліва прыслужвае яму, але ў час яго адсутнасці жыве думкамі аб мужчыне, ад якога нарадзіла Ядвісю. Яна прапускае важныя этапы ў сталенні сыноў праз паглыбленасць у сябе, свае ўспаміны і ўяўленні, якія часам становяцца важнейшымі нават за дачку. Пані Сташэўская трымаецца за мужа-п'яніцу як за сваё звыклае апірышча ў жыцці, але пры гэтым «супроць волі ўспамінае праўдзівага Ядзінага бацьку, маладзенькага белакурага падпаручыка, забітага на японскай вайне, думае пра п'янага мужа – і змагаецца з радасцю, што ніхто ў цэлым свеце пра тое не ведае» [9, с. 297]. Супрацьпастаўленне мусовай вернасці мужу і здрады ў шлюбе дзеля пошуку шчасця спараджае дыхатамію ахвяры і «злачынца» (жонкі-здрадніцы).

Бяда змусіла зняверыцца ў сабе і гераіню апавядання «Уцекачы» (з нізкі «Сібірскія абразкі»). Апавядальнік сустракае на халоднай вуліцы хлопчыка-жабрака з беларускай гаворкай і заходзіць у брудную каморку – жытло яго сям'і. Дзве жанчыны і хлопчык вымушаны жыць у галечы і прасіць падаянне. Хворая маці, якая ўжо не ў стане працаваць, прызнаецца герою-апавядальніку, што яны ўцекачы (мяркуючы па даце напісання твора, уцякаць сям'і давялося ад ваеннай навалы), але разам з гэтым сцвярджае: «на ліха было і ўцякаць… Старога пахавалі ў дарозе, кінулі, беднага, у яму, не раўнуючы, як якога сабаку. Хай свят ляжыць! Спалохаліся немаведама чаго, паехалі, і мы следам за ўсімі, у вір з галавой, на край свету. От дурныя мы…» [9, с. 322]. Гэтамі словамі маці сцвярджае, што памылілася, калі паддалася агульнаму настрою і рушыла следам за грамадой у глыб Расіі, але замест выратавання сям'ю чакала безвыходнасць. Бядуючы, жанчына вінаваціць сябе за гора, наканаванае дзецям. Гэтыя, з аднаго боку, станоўчыя дзеянні, у якіх яна імкнулася абараніць дзяцей, уцячы ад небяспекі, апынуліся для іх галечай, жабрацтвам і амаль сіроцтвам, канфліктам ва ўнутраным свеце жанчыны. Такім чынам у яе вобразе выяўляецца дыхатамія злачынца і дабрадзея.

Падобную канцэпцыю мы бачым і ў апавяданні «Маці», дзе жанчына, якая стала ахвярай гвалту падчас пагулянкі з хлопцам, нараджае дзіця з памкненнем пазбавіцца ад яго. У нейкае імгненне спрабуе падкінуць яго пад дзверы папу. Увесь час патэрн ахвяры, палахлівай «ціхоні» пераважае яе мацярынскія пачуцці. Жанчына вяртаецца па дзіця, бо яе могуць пазнаць па вопратцы, у якую яно было спавіта, і топіць халоднае цельца ў рэчцы на ўскрайку сяла. Паднятая ў творы сацыяльная праблема куды шырэйшая за тэму мацярынства і можа быць вызначана як тэма прыняцця грамадствам правоў і значнасці сацыяльна ніжэйшага чалавека, «грэшнай» жанчыны, бо інакш будзе множыцца зло. Уведзеная ў твор характарыстыка дзяўчыны як «ціхоні» дае магчымасць выявіць яе непрыкметнасць, нявылучанасць са звыклага людскога кола, агульную абыякавасць да яе з боку іншых людзей, а яшчэ больш – уласных бацькоў. Нягледзячы на відавочныя змены ў паводзінах дзяўчыны пасля згвалтавання, якія нам апісвае аўтар, бацькі не звяртаюць на яе ўвагі, што ўказвае на адсутнасць блізкіх адносін паміж бацькамі і дзецьмі. Гэта непасрэдна паўплывала і на паводзіны галоўнай гераіні пасля нараджэння дзіцяці. Галоўнае, што кіруе паводзінамі жанчыны на працягу ўсяго твора – гэта страх. Яна баіцца бацькоў, супольнасці, але не баіцца загубіць уласнае дзіця – выяўленая дыхатамія ахвяры і злачынца.

Падобны вобраз «ціхоні» мы бачым і ў апавяданні «Літоўскі хутарок» у сцэне, калі Даміцэля павяла сваю згвалтаваную дачку Монцю да святара (кунігаса). Можам зрабіць дапушчэнне, што аўтар наўмысна ўводзіць вобраз ненароджанага дзіцяці ў твор, каб паказаць, перад якой праблемай паўстае маладая дзяўчына пасля злачынства вайскоўцаў: «Цераз дзень, баючыся, каб

саўсім не выйшла з розуму дзеўка, павяла яе да кунігаса:

– Калі будзе, то і твой гэта дзіцёнак, Монька. Маліся Матцы Божай.

– Не хачу я яго, – залівалася слязамі Монця.

– Маліся, Монечка, – Бог дасць дзіва, і ўсё абыдзецца так, як Богу заўгодна.

– А калі не будзе дзіва? Не магу я маліцца і жыць не хачу» [9, с. 111].

Гэты ўрывак твора выяўляе дыхатамію жыцця і смерці, тую трагічную сітуацыю, калі нараджэнне дзіцяці непарыўна звязана з нежаданнем маці жыць, а каб жанчына працягнула жыць – трэба, каб дзіця не нараджалася. Аўтар прадстаўляе перад чытачом чарговы прыклад маці-ахвяры, для якой само дзіця можа стаць сімвалам болю, гвалту і сораму. Жанчына не прымае яго нават на ўзроўні дапушчэння, нягледзячы на словы святара, што «Бог дасць дзіва» і што гэта таксама і яе дзіця. Праз гэтыя сюжэтныя перыпетыі мы бачым, як жанчына адмаўляе не толькі чужое, але і сваё, тое, што звязвае яе з пакутамі. Такім чынам дваістасць вобраза выяўляецца і на ўзроўні адцурання Монці ад свайго, што можа быць расцэнена ў негатыўным ключы, але праз факт згвалтавання дзяўчыны яе адчай не можа быць адназначна асуджаны.

Другі вобраз маці ў гэтым творы – Даміцэля, жанчына, для якой дзеці важней за страх падчас вайны. На працягу цэлага апавядання яна трывожыцца за сыноў і клапоціцца пра дачок: даглядае хворую Ядвісю, турбуецца пра пакрыўджаную Монцю, спрабуе сляпымі вачамі расчытаць ліст ад сына, які ляжаў у лазарэце. Свет гэтай жанчыны выяўлены аўтарам недастаткова, каб раскрыць яе як асобу, але якраз у той ступені, каб раскрыць яе як выдатную маці, для якой клопат пра дзяцей вышэй за небяспеку.

Гэтаксама адназначна, як і вобраз Даміцэлі, можа быць расчытаны вобраз Таццяны Турботнай з апавядання «Панская сучка». У ім жанчыну, якая толькі што страціла сына, бяруць выкормліваць шчанят, але тыя ў выніку паміраюць. Вінаватай прызнаюць Таццяну і катуюць да смерці. У гэтым творы вельмі важнай выступае другая глава, у якой аўтар найбольш поўна раскрывае вобраз маці Таццяны Турботнай. Жанчына адмаўляецца ехаць да пана, не пахаваўшы свайго сына: «Не паеду!! Забіце, замучце – не паеду я!.. Не пайду ад свайго сыночка. Не аддам яго малачко на панскія лекі... Не паеду!» [9, с. 226]. Гэтыя словы выяўляюць жанчыну як турботлівую (што адзначана і ў гаваркім прозвішчы) маці, якая сапраўды любіць свайго пакойнага ўжо сына. Супрацьстаіць словам маці выказванне адной з жанчын: «Няхай Бог крые, як ты гаруеш, быццам па вялікім» [9, с. 226]. Так, М. Гарэцкім выяўлена жорстка-прагматычнае стаўленне да смерці чалавека як да страты найперш працоўнай сілы, каштоўнага рэсурса, магчымага прыбытку. Гэта дадаткова ўказвае на безумоўную і шчырую любоў Таццяны да сына, нягледзячы на тое, што ён быў зусім малы. Такім чынам, у гэтым творы жанчына паўстае ахвярай страт і акалічнасцей.

Аналізуючы вобраз маці ў творчасці Максіма Гарэцкага, неабходна звярнуць увагу на тое, якую ролю ў жыцці пісьменніка выконвала яго ўласная маці. Паводле ўспамінаў Гаўрылы Гарэцкага, на фарміраванне асобы пісьменніка вялікі ўплыў мела спадчына бацькоў. Рысы характару маці і бацькі ў асобе Максіма Гарэцкага спалучаліся, але разам з гэтым былі абсалютна супрацьлеглымі, праз што дыхатамія характараў выяўляецца ўжо ў псіхатыпе самога аўтара: «Па характары Максім пайшоў у бацьку. Яскравы сангвінік, з праявамі халерычнасці, надзвычай жывы, рухавы, палкі, уражлівы, непасрэдны, актыўны, успрыімлівы. Але і ад маці многае перайшло ў характар брата. Выключная дабрата, цярплівасць, стрыманасць, разважнасць, невычэрпны аптымізм, летуценнасць, самаахвярнасць. Супрацьлегласць характараў бацькі і маці праявіліся і ў характары Максіма; бацькаў і матчын пачатак змагаліся ў істоце Максіма ўсё жыццё, але матчына спадчына звычайна перамагала» [10, с. 15].

Гаўрыла Гарэцкі адзначаў, што маці заўсёды выконвала асаблівую ролю ў жыцці пісьменнніка, ён быў уважлівы да яе аповедаў і песень: «Максім, Парфір, Ганначка і я прымасціліся каля мамы і слухаем яе песні, нам так добра… А потым пачынаюцца доўгія гамонкі. Максім распытвае ў мамы пра ўсіх родных, пра ўсе багацькаўскія сем’і, іх гісторыі, пра прыгон і падзеі пасля прыгону, пра панскіх казакоў і стражнікаў, бойкі з імі, падзеі 1905 года»; «Гамонкі Максіма з мамай былі доўгія, ласкавыя, задушэўныя. Цяпер Максім пачаў запісваць маміны песні і казкі, а таксама апавяданні пра жыццё родных і знаёмых» [10, с. 15]. Максім Гарэцкі выдатна ўсведамляў цяжкасць жыцця вясковай жынчыны, праз што адзначаў: «Моц духоўную ў цяжкім жыцці прыдавала Еўфрасінні Міхайлаўне [маці. – *К. К.-Т.*] не вера ў Бога, а паэтычнасць яе душы, веданне стольких песень, народных абрадаў, здольнасць адчуваць хараство іх і хараство прыроды» [10, с. 38].

Асаблівую сувязь паміж Максімам Гарэцкім і Еўфрасінняй Міхайлаўнай можна адзначыць не толькі ў памкненнях сына да маці, але і ў яе захапленні поспехамі свайго сына: «Максім часта граў на скрыпцы і дудках-жалейках, хораша граў. З вялікім захапленнем слухала ўся сям’я, асабліва мама, як пела і галасіла Максімава скрыпка» [10, с. 16].

Міжасабовыя ўнутрысямейныя адносіны маці і сына, асабліва – сямейная трагедыя Гарэцкіх (так, ім усім, і найперш маці, Еўфрасінні Міхайлаўне, давялося перажыць страту адзінай дачкі Ганны), безумоўна паўплывалі на рост таленту М. Гарэцкага. З іншага боку, зробім дапушчэнне, што крыніцай неаднастайнасці, складанасці характара жанчыны-маці ў творчасці Максіма Гарэцкага зрабіліся яго назіранні за жыццём аднавяскоўцаў. М. Гарэцкі імкнуўся зразумець гэты калектыўны досвед яшчэ з дзяцінства, і некаторых

землякоў выявіў у «Камароўскай хроніцы»: «жалеў і любіў старых – дзядзьку, і дзядзіну, і цётку, і Тараса – сіраце спачуваў. У Адаркі маленькія дзеці ўміралі, і ўсё ля палка люлька вісела з хворым дзіцянём. Адарка кашляла і курыла» [10, с. 16].

Жыццёвыя драмы і трагедыі (такія, як траўма ад страты немаўляці, бяда з дзяўчынай ці жанчынай) вызначаліся выразнай паўтаральнасцю ў жыцці землякоў Максіма Гарэцкага. Гэта дазваляла пісьменніку разумець рэакцыі аднавяскоўцаў на бяду як псіхалагічны патэрн у паводзінах, і ён раскрываў такія патэрны ў сюжэтах з мастацкімі вобразамі-персанажамі.

*Заключэнне.* Вобраз маці ў жыцці і творчасці Максіма Гарэцкага меў вялікае значэнне: аўтар разумеў яго каштоўнасць і складанасць, усведамляў ступень жаночай неабароненасці ў сям'і і грамадстве, глыбіню матывацыі добрых ці злых жаночых учынкаў. Аналітычны разгляд вобразаў маці ў такіх творах, як «Маці», «Панская сучка», «Дзве душы», «Літоўскі хутарок», «Супакой», «Уцекачы» дазволіў абгрунтаваць выснову пра ўзаемасувязь добрага і злога, ролі адначасова ахвяры і злачынца, якую выконваюць персанажы-маці ў прозе пісьменніка: гэта мужныя абаронцы сваіх дзяцей у любых абставінах і «ціхоні», фатальна залежныя ад меркавання іншых пра сябе; «грэшніцы» і ахвяры гвалту падчас вайны ці праз сацыяльны прыгнёт.

Адметны вобраз маці ў творчасці Максіма Гарэцкага звязаны з архетыпам ахвяры. Аўтар успрымаў мацярынства як складаны і неадназначны працэс. Ён раскрываў вобраз маці не з пазіцыі дзіцёнка, для якога жанчына з'яўляецца ўсемагутнай, бясстрашнай, пяшчотнай і мудрай, а з пазіцыі дарослага – з усведамленнем недасканалай чалавечай прыроды. У памкненні да лепшага персанажы Максіма Гарэцкага часта допускаюць памылкі, якія ў далейшым становяцца лёсавызначальнымі. Пісьменнік праз мастацкія вобразы рэалістычна паказваў правіны жанчын перад дзецьмі, але разам з гэтым імкнуўся не асуджаць, а раскрываць матывацыі парадаксальных рэакцый асобы на розныя сітуацыі, тым самым уздымаючы сацыяльную праблему неадназначнасці чалавечых паводзін у дысгарманічным грамадстве, асабліва ў сацыяльна сфарміраванай ролі маці.

Вышэйпрыведзеныя фрагменты з успамінаў Гаўрылы і Галіны Гарэцкіх пацвярджаюць, што асоба маці і ў жыцці пісьменніка была ключавой, любоў да яе ўплывала на станаўленне маладога празаіка і дапамагала яму ствараць вобразы жанчын з рэалістычнай абмалёўкай іх псіхалогіі. Максім Гарэцкі настолькі глыбока разумеў матывацыі паводзін жанчыны, што як пісьменнік змог абмалёўваць рысы спецыфічна-жаночага светаадчування.

Пытанне аб прыродзе фарміравання дыхатаміі вобраза маці ў прозе Максіма Гарэцкага заслугоўвае асобнай увагі даследчыкаў яго жыцця і творчасці.


### Літаратура

1. *Адамовіч, А.* «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» / Алесь Адамовіч. – Мінск : БДУ, 1980. – 224 с.
2. *Бугаёў, Д. Я.* Максім Гарэцкі / Д. Я. Бугаёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 163 с.; Бугаёў Д. Максім Гарэцкі / Дзмітрый Бугаёў. – 2-е выд., выпр, дап. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 239 с.
3. *Мушынскі, М.* Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі : жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі ; навук. рэд. А. М. Макарэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 510 с.
4. *Дасаева Т.* Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага / Т. Дасаева. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 87 с.
5. *Губская, В. М.* Класіка ХХ стагоддзя: прыхаваныя таямніцы рамана «Віленская камунары» М. Гарэцкага / В. М. Губская. – Мінск : РІВШ, 2016. – 108 с.
6. *Белая, А. І.* Чалавек у плыні часу: мастацкая канцэпцыя асобы і тыпалогія характараў у беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя : манаграфія / А. І. Белая. – Баранавічы : БарДУ, 2009. – 408 с.
7. *Губская, В. М.* Рэканструкцыя архетыпа як сродак спасціжэння аўтарскага несвядомага (на прыкладзе твораў М. Гарэцкага вяцкага перыяду) / В. М. Губская // Bialorutenistyka Bialostocka. – Беласток, 2020. – Том 11. – С. 123–137.
8. *Гарэцкі, М.* Дзве душы // Гарэцкі М. Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 629 с.
9. *Гарэцкі, М.* Поўны збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – Т. 1. Апавяданні. – 456 с.
10. Максім Гарэцкі. Вернасць высокім ідэалам : успаміны, аповесці, апавяданні, запіскі / укладанне Р. Гарэцкага, В. Шніпа ; мастак У. Свентахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 2018. – 317 с.

### References:

1. *Adamovich, A.* «Bramu skarbaŭ svaih adchynyayu…» / Ales' Adamovich. – Minsk : BDU, 1980. – 224 s.
2. *Bugayoŭ, D. Ya.* Maksim Garecki / D. Ya. Bugayoŭ. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1968. – 163 s.; Bugayoŭ D. Maksim Garecki / Dzmitryj Bugayoŭ. – 2-e vyd., vypr, dap. – Minsk : Belarus. navuka, 2003. – 239 s.
3. *Mushynski, M.* Padzvizhnik z Maloj Bagac'kaŭki : zhyccyovy i tvorchy shlyah Maksima Gareckaga / M. Mushynski ; navuk. red. A. M. Makarevich. – Minsk : Belarus. navuka, 2008. – 510 s.
4. *Dasaeva T.* Letapis zhyccya i tvorchasci Maksima Gareckaga / T. Dasaeva. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1993. – 87 s.
5. *Gubskaya, V. M.* Klasika HH stagoddzya: pryhavanyya tayamnicy ramana «Vilenskaya kamunary» M. Gareckaga / V. M. Gubskaya. – Minsk : RIVSh, 2016. – 108 s.
6. *Belaya, A. I.* Chalavek u plyni chasu: mastackaya kancepcyya asoby i typalogiya haraktaraŭ u belaruskaj proze pershaj treci HH stagoddzya : managrafiya / A. I. Belaya. – Baranavichy : BarDU, 2009. – 408 s.
7. *Gubskaya, V. M.* Rekanstrukcyya arhetypa yak srodak spascizhennya aŭtarskaga nesvyadomaga (na prykladze tvoraŭ M. Gareckaga vyackaga peryyadu) / V. M. Gubskaya // Bialorutenistyka Bialostocka. – Belastok, 2020. – Tom 11. – S. 123–137.
8. *Garecki, M.* Dzve dushy // Garecki M. Tvory: Dzve dushy: Apovesc'. Apavyadanni. Zhartaŭlivy Pisarevich: P'esa. Litaraturnaya krytyka i publicystyka. Listy. – Minsk : Mastackaya litaratura, 1990. – 629 s.
9. *Garecki, M.* Poŭny zbor tvoraŭ : u 4 t. / M. Garecki. – Minsk : Mastackaya litaratura, 1984. – T. 1. Apavyadanni. – 456 s.
10. Maksim Garecki. Vernasc' vysokim idealam : uspaminy, apovesci, apavyadanni, zapiski / ukladanne R. Gareckaga, V. Shnipa ; mastak U. Sventahoŭski. – Minsk : Mast. lit., 2018. – 317 s.